дадзеным выпадку не прынцыпова. Згодна класіфікацыі Фокс-Дэвіса, дзе ён падрабязна разглядае мноства ўсялякіх геральдычных фігур, у раздзеле "Рэптыліі", усе гэтыя пачвары аб'яднаныя ў адзіны комплекс – Serpents (змеі) [7, p. 193 ].

### СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Акты, издаваемые комиссиею, высочайше утверждённой для разбора древних актов в Вильне. (АВАК). Т. 5.
2. фон Винклер П.П. Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи внесённые в Полное собрание законов с 1649 по 1900. С.-Петербург, 1899.
3. Памятка по вопросам городской и территориальной символики для представителей местных органов власти // Комитет по архивам и делопроизводству Республики Беларусь, Государственная геральдическая служба. Минск, 1996.
4. А.К.Цітоў. Геральдыка беларускіх местаў. Мн., 1998.
5. Л.В.Спаткай. Герб Пружан. Мифы и факты//»Гербовед», № 21, 9. 1997, Москва. С. 38.
6. А.К. Цітоў. Пячаткі старажытнай Беларусі. Мн., 1993. С. 226.
7. Fox-Davies A.C. A Complete Guide to Heraldry. London. 1968. P. 193.


УДК 930.2 (476.7)

***Гладышчук А.А.***

# РОД ТАЛОЧКАЎ ГЕРБУ ПОБУГ З РАКАВІЦЫ (БРЭСЦКІ РАЁН)

Колішняя сядзіба Ракавіца, якая знаходзіцца прыкладна ў 15 кіламетрах на поўнач ад Брэста, у пісьмовых крыніцах упершыню ўзгадваецца ў 1524 годзе [1,2]. Актам польскага караля Яна Казіміра [3] ў 1667 годзе гэты маёнтак канфіскуецца разам з вёскамі Ракавіца, Чалеева і Перапекі ў сям'і Старавольскіх за забойства і передаецца новым уладарам Ляшчынскім за вайсковыя заслугі. Але зусім хутка па невядомай нагодзе сядзіба пераходзіць у рукі князёў Шуйскіх, якія валодалі ў той час вёскай Церабунь (месца зліцця ракі Лясной з Заходнім Бугам). У 1738 годзе ўсю маёмасць разам з вёскамі ў князя Ігнація Шуйскага, берасцейскага харунжага, купляе Станіслаў Талочка (нар. у 1700 г.), чэснік жмудскі. З таго часу і да вядомых падзей 1939 года маёнткам валодалі 200 годоў Талочкі. Уладанні ад Станіслава перайшлі да яго сына, Пятра Талочка (1730-1776), стольніка вендзенскага, які парадніў свой род с князямі Шуйскімі, таму што яго жонкай стала княгіня Тэрэса Шуйская. Потым маёнткам правіў іх сын Казімір (нар. у 1775 г.), гарадскі суддзя брэсцкага павету, жанаты на Рэгіне Скірмунт. А ўжо яго сын, Ян Талочка (1819-1903), які ўзяў шлюб з Каралінай з Ясклоўскіх (1840-1917), маладзейшай за яго на 21 год, надумаў будаваць новую сядзібу ў Чалеева (3 км ад Ракавіцы). Рэалізацыі планаў перашкодзіла вядомае паўстанне за незалежнасць 1863 года, у якім Ян прымаў актыўны ўдзел, разам са сваякамі: бацькам жонкі і яе братам у атрадзе Стасюкевіча, які быў разбіты пад Каралёвым Мастом (сённяшнія Камянюкі). Пасля разгрому паўстання Ян разам з бацькам жонкі ў 1864 годзе апынуўся ў Сібіры, у Табольску, а маёнтак падпадаў пад канфіскацыю. Але яго браты змаглі хутка зарыентавацца і падзяліць маёмасць паміж сабою (да таго часу маёнтак быў цэласны), аддаўшы на канфіскацыю невялікі фальварак Забур'е (сённяшні сельскагаспадарчы комплекс «Заходні»), быццам адзіную ўласнасць Яна Талочкі. Такім чынам Ракавіца адышла да малодшага брата – Юльяна, якой той валодаў да першай сусветнай вайны. Пад час эвакуацыі ў бежанцы ў 1915 годзе Юльян нечакана памірае ў Мінску, і ў 1919 годзе Ракавіца адыходзіць да малодшага сына Яна, Тэадора Талочкі (1876-1946), які застаўся ў гісторыі роду, як апошні гаспадар гэтай фамільнай сядзібы Талочкаў у Ракавіцы. Яго старэйшыя браты на гэты час апынуліся далёка ад родных мясцін і справы мелі зусім іншыя.

Род Талочкаў – старажытны, карыстаецца гербам Побуг (здымак 1), і першыя згадкі аб ім прасочваюцца з полацкіх і літоўскіх летапісаў XIV і XV стагоддзяў [4]. Былі ў гэтым родзе і князі, але заснавальнікам той пратапласты ў Вялікім Княстве Літоўскім, пра якую ідзе гаворка, з'яўляецца Пётр Талочка (1520-1590), падсудак Троцкі, сын якога Ян быў гарадскім суддзёй у Гродне. Ягоны прамы нашчадак Станіслаў Талочка, чэснік жмудскі, у 1738 г. купіў у князя Ігнація Шуйскага маёнтак Ракавіцу з вёскамі, аб чым гаворка ішла вышэй, і дадаў да свайго прозвішча яшчэ адно «л». З таго часу яго нашчадкі мелі прозвішча Tołłoczko, а ў далейшым, калі сталі расійскімі дваранамі, – Толлочко.




***Здымак 1.*** Герб Побуг.

Але звернемся зноў да Яна Талочкі (здымак 2), які ажаніўся з Каралінай з Ясклоўскіх (здымак 3), яшчэ да высылкі яго ў Сібір, дзе ён прабыў 6 гадоў, пачаўшы адбываць пакаранне ў Табольску. Цікава заўважыць, што яго маладая жонка Караліна са сваёй малодшай сястрой адразу пасля высылкі бацькі і мужа ў Сібір, спрабуюць трапіць на аўдыенцыю ў Вільні да расійскага генерал-губернатара Мураўёва (праўда-

***Гладыщук Анатолий Антонович***, *к.ф.-м.н., зав. каф. физики Брестского государственного технического университета. Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

нага ў народзе "Вешальнікам"), каб неяк уратаваць сваю маёмасць. Неверагодна, але праўдамі і няпраўдамі ў сатрапа ўдалося атрымаць кароткую аўдыенцыю. Выслухаўшы на французскай мове петыцыю запалоханных маладых жанчын, губернатар не стрымаўся: «Вон отсюда мятежницы!». Але нават такі адмоўны вынік дапамог хутка і правільна зарыентавацца братам Яна і выратаваць ад канфіскацыі Ракавіцу, якая яшчэ на паўстагоддзя засталася радзінным гняздом.



**Здымак 2.** Ян Талочка (1819-1903).



**Здымак 3.** Караліна Талочка з Ясклоўскіх (1840-1917)

Караліна Талочка, жонка Яна, на гэтым не супакоілася і арганізавала актыўную падтрымку высланых у Сібір. Яна не адзін раз прадпрымае рызыковую вандроўку да месца ссылкі мужа і бацькі, напамінаючы чымсці гэтым расійскіх дзекабрыстак. Яна не толькі аблегчыла лёс зняволенных блізкіх людзей, але ў выніку гэтых візітаў у іх сям'і з'явілася двое сыноў: спачатку – Станіслаў (1868), у будучым знакаміты прафесар хіміі, а потым Людвік (1870) – будучы інжынер-электрык і міністр пошт і тэлеграфаў. Гэта была адчувальная кампенсацыя за страту волі.

Пасля вяртання з выгнання да сям'і Яну Талочку было дазволена ўладай пражываць толькі на захад ад лініі Бугу, што вымушала шукаць нейкія часовыя рашэнні. Мінавіта таму наступны сын Тэадор, будучы старшыня брэсцкага сельскагаспадарчага таварыства ў час паміж сусветнымі войнамі, нарадзіўся ў маёнтку Кляноўніца на Падляссі ў 1876 г., там жа пабачыў свет і яго малодшы брат Казімір (1879 г.). Але на роднае Палессе бацькоў вельмі цягнула, і ў рэшце-рэшт ім пашчасціла асесці ў Шчытніках паблізу ад Ракавіцы. Атрымаўшы пачатковую адукацыю дома, сыны адзін за другім адправіліся ў рускую гуманітарную гімназію ў Бяла-Падляску (за 30 км ад Брэста па шляху да Варшавы), але ніхто з іх не стаў гуманітарыем. Праўда, трэба адзначыць, што правілы навучання ў гімназіі былі даволі строгімі, забаранялася усё польскае, што тым самым садзейнічала росту ў вучняў польскага патрыятызму, але галоўнае, гімназія давала добрыя веды з пазіцыіі навук, якія ў ёй былі вельмі высока пастаўлены. Таму ўсе браты атрымалі грунтоўную сярэднюю адукацыю і маглі бегла размаўляць на латыні, на грэчаскай мове і па-французку. Гімназія асабіста кожнаму давала таксама падставу для атрымання далейшай адукацыі ў любой расійскай вышэйшай навучальнай установе, што братамі ў далейшым было добра скарыстана. Іх бацька – Ян Талочка (памёр у 1903 г.) і маці – Караліна Талочкава з Ясклоўскіх (памерла ў 1917 г.) былі пахаваны на радзінных могілках у Ракавіцы, права жыць у якой яны былі пазбаўлены, і іх магілы ў Ракавіцы захаваліся да гэтага часу (здымак 4).



**Здымак 4.** Радзінныя могілкі ў Ракавіцы (сучасны выгляд).

Старэйшы з сыноў Яна і Караліны Станіслаў Кароль Талочка [5,6] нарадзіўся 22 жніўня 1868 года ў маленькай вёсцы над Бугам Чалеева (Брэсцкі раён), якая ў той час належыла аднаму з братоў Яна. Пасля заканчэння гімназіі ў Бяла-Падлясцы, ён падаўся на юрыдычны факультэт Варшаўскага ўніверсітэту, але навука права штосьці яму не пайшла, і ён праз сяместр навучання пераводзіцца на фізіка-матыматычны факультэт таго ж універсітэту, дзе 8 сяместраў вывучае хімію. Ужо на першых курсах юнак праявіў даследчыя здольнасці і быў заўважаны расійскім прафесарам Е.Е.Вагнэрам. Гэта дапамагло яму пасля заканчэння універсітэта атрымаць стыпендыю на навуковую стажыроўку да Германіі ў Гёттынген да будучага нобелеўскага лаўрэата Вальтэра Нэрста. Абараніўшы дысертацыю, ён вярнуўся да Кракава ў Ягелонскі універсітэт, дзе быў пастаўлены перад выбарам: дацэнтура ў Варшаўскім універсітэце, ці аўстрыйскае грамадзянства. Хутчэй прыйшлі паперы з Аўстрыі, што і вызначыла жыццёвы шлях Станіслава Талочкі. Ён яшчэ раз вяртаецца да Германіі, дзе працуе з Ф.Хабэрам, таксама будучым нобелеўскім лаўрэатам, і робіць значныя навуковыя поспехі ў зусім новай галіне – фізічнай хіміі, што дапамагло яму стаць знакамітым вучоным. Пасля абароны доктарскай дісертацыі С. Талочка атрымоўвае пасаду прафесара ў Львоўскім універсітэце (здымак 5), з якім звязвае ўсё сваё далейшае жыццё. Тут у Львове ён стварыў першакласную па тым часам навукова-даследчую лабараторыю і атрымаў значныя вынікі ў розных галінах

фізічнай хіміі, што дазваляе яго лічыць адным са стваральнікаў фізічнай хіміі. Падручнікі па хіміі прафсcара С.Талочкі лічыліся аднымі з лепшых і карыстаюцца попытам да гэтай пары. Можна толькі шкадаваць, што яны не перакладзены з польскай мовы на беларускую, ці расійскую.



***Здымак 5.*** Прафесар Станіслаў Талочка, Львоў, 1920-я гады.

Ужо па заканчэнні першай сусветнай вайны прафесар С.Талочка зацікавіўся праблемамі электрахіміі, з гэтай мэтай ён пасылае свайго вучня В.Кемулу на стажыроўку ў Прагу. Гэты правільна выбраны крок вызначыў развіццё ў Львове цэлай галіны – паліграфіі, якой сёння так не хапае ў нашым Брэсце. Не будзем пералічваць іншых заслуг прафесара [7], але пасля смерці ў выніку цяжкай хваробы сэрца 5 сакавіка 1935 года, труну з целам прафесара даставілі з Львова на радзіму ў Ракавіцу па яго апошняму жаданю. Вандалы ў 60-х гадах ужо мінулага стагоддзя выкінулі труну з прахам прафесара з капліцы і надглуміліся з яго. Але мясцовыя жыхары свайго земляка перазахавалі і паказалі магілу праз многа гадоў ягонай роднай пляменніцы – Зоф'і Талочка. А ўжо ў апошні час удзячныя землякі ўсталявалі на магіле прафесара сціплы помнік (здымак 6). У Ракавіцы засталася яшчэ адна памяць аб прафесары – тапаліная алея, якую ён пасадзіў у канцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Сёння тых дрэваў засталося менш за палавіну, ды і тыя моцна пашкоджаны чалавекам (здымак 7). А так хацелася бы, каб памяць аб таленавітым земляку засталася.

Людвік Талочка нарадзіўся ў Ракавіцы 20 кастрычніка 1870 года. У гэты час яго бацька Ян яшчэ адбываў ссылку. Услед за старэйшым братам Станіславам ён закончыў гімназію ў Бяла-Падлясцы, але працягваць адукацыю вырашыў у Пецярбургу ў Электратэхнічным інстытуце. Чым такі выбар быў абгрунтаваны, застаецца невядомым.

Пасля вынаходніства тэлефона і ўвядзення ў дзеянне ў Нью-Хейвене (ЗША) ў 1878 годзе першай дзеючай тэлефоннай станцыі было несумненным тэхнічным шыкам кожнаму правіцелю вызначыцца ў сваёй краіне тэлефонам. Расія ў гэтым сэнсе не была выключэннем, і ў ліку першых імпартавала тэлефоны ў Пецярбург у пачатку 1880-х гадоў. Маштабы тэлефанізацыі сталіцы Расійскай дзяржавы патрабавалі адукаванага і дзейнага інжынера, і такі чалавек хутка знайшоўся. У 1901 годзе на пасаду галоўнага інжынера будаўніцтва тэлефоннай сеткі Санкт-Пецярбурга ўрадам быў назначаны Людвік Талочка (здымак 8), які ў 1891 годзе скончыў Тэхнічную школу інжынераў телеграфіі ў Пецярбургу, перайменаваную пазней у Электратэхнічны інстытут [8-13]. Для вызначэння на такую адказную пасаду Л.Талочка меў да таго часу добры практычны вопыт работы ў тэхнічных аддзелах дырэкцый поштаў і тэлеграфаў Харкава і Палтавы, а вярнуўшыся ў Пецярбург – у цэнтральны дэпартамент поштаў і тэлеграфаў, ён атрымаў у распараджэнне таксама адзіную тады выпрабавальную электрычную станцыю ў Электратэхнічным інстытуце. У гэтым чалавеку было ўсё: маладосць, талент, вопыт і жаданне праявіць сябе.



***Здымак 6.*** Магіла прафесара С.Талочкі ў Ракавіцы (на другім плане паўразбураная капліца) – сучасны выгляд.

З 1901 года і да кастрычніцкага перавароту ў 1917 годзе, які змяніў усё, будаўніцтвам і эксплуатацыяй тэлефоннай сеткі ў Пецярбургу кіраваў інжынер-электрык Людвік Талочка. Галоўныя дзеючыя асобы гісторыі таго перыяду: імператар Мікалай II, старшыня Часовага ўрада Аляксандр Керанскі, старшыня рэвалюцыйнага Саўнаркама Уладзімір Ульянаў (Ленін) і іншыя выкарыстоўвалі для сувязі тую самую тэлефонную сетку Пецярбурга-Петраграда.

У той час, калі малады і захоплены Людвік Талочка разгарнуў будаўніцтва тэлефоннай сеткі ў Пецярбургу, туды прыехала маладая настаўніца з Францыі Марыя Магдаліна Саукс, якая стала яго жонкай. У 1905 годзе ў іх нарадзілася старэйшая дачка Казіміра, а ў 1909-м – малодшая Баляслава. Людвік Талочка ў гэты перыяд становіцца адным з вядучых расійскіх спецыялістаў у новай галіне электрычных камунікацый. З яго імем звязана таксама з'яўленне ў Санкт-Пецярбургу трамвая, які ён праектаваў і запускаў у сталіцы Расійскай імперыі.

Вайна і рэвалюцыя вярнулі Польшчы незалежнасць, і Людвік Талочка тут жа быў запатрабаваны. У снежні 1918 г. ён быў прызначаны новым урадам адроджанай Польшчы віцэ-міністрам поштаў і тэлеграфаў, але выехаць з ахопленага рэ-

валюцыяй і разрухай Петраграда змог толькі праз год, дзе яго ўжо чакала пасада міністра.



**Здымак 7.** Тапаліная алея прафесара С.Талочкі ў Ракавіцы.

Як успамінае цяпер яго родная пляменніца Зоф'я Талочка, якая жыве ў Варшаве, дзядька пасяліўся ў Варшаве з сям'ёй у асабняку на Прэзідэнцкай вуліцы, 7, і быў тады даволі заможным. На кожнае свята ў доме прымалі сваякоў з польскімі стравамі, якія вельмі адрозніваліся ад французскай кухні. Марыя Магдаліна старанна вучылася польскім звычаям, але з сваім мужам заўсёды размаўляла толькі па-французску і сваіх дзяўчынак на канікулы заўсёды адвозіла ў любімую ёю Францыю. Старэйшая Казіміра была падобная на маці, але больш цягнулася да польскай культуры і вывучала паланістыку ва ўніверсітэце; малодшая ж Баляслава была больш падобная на бацьку, але цягнулася да Францыі і паехала атрымліваць адукацыю ва ўніверсітэт у Львоў да свайго дзядзькі – прафесара хіміі Станіслава Талочкі, што ў далейшым выратавала яе ад гібелі.

Людвік Талочка, стаўшы міністрам, інтэнсіўна працаваў над планам электрафікацыі Польшчы, а значыць, і зямель, якія ўваходзілі тады ў яе склад, прасцей кажучы, ажыццяўляў нешта накшталт плана ГОЭРЛО і ў Заходняй Беларусі на сваёй радзіме. Пасля выхаду Ю.Пілсудскага з урада ён пакідае пасаду міністра поштаў і тэлеграфаў у жніўні 1926 г., але ў той жа час з'яўляецца членам і старшынёй дзяржаўнага савета по электрычнасці і старшынёй польскага энэргетычнага камітэта (гэта былі грамадскія пасады), прадстаўляе Польшчу на ўсіх міжнародных канферэнцыях па электрычнасці. Пры гэтым галоўная яго дзейнасць да пачатку другой сусветнай вайны ў 1939 годзе была звязана з акцыянернымі таварыствамі по электрыфікацыі Польшчы.

19 лютага 1943 года гестапа арыштавала Людвіка Талочку з жонкай і старэйшай дачкой Казімірай, малодшую выратавала толькі тое, што яна ў гэты час выйшла замуж і заставалася ў Львове. Відаць, гітлераўцы напалі на след антыфашысцкай польскай арганізацыі, якую мог падтрымліваць Л.Талочка. Ён з сям'ёй і іншымі сваякамі быў змешчаны ў варшаўскую турму Повяк, пасля чаго іх транспартавалі ў Асвенцім. Марыя Магдаліна і яе старэйшая дачка Казіміра не вытрымалі нечалавечых выпрабаванняў і іх не стала праз некалькі месяцаў. Інжынер Людвік Талочка дачакаўся вызвалення ў 1945 годзе і да самай смерці жыў са сваёй малодшай дачкой Баляславай у Лодзі. Памёр інжынер-электрык Людвік Талочка, наш зямляк 9 мая 1957 года ў Лодзі, там ён і пахаваны. Яго нашчадкі ад малодшай дачкі Баляславы жывуць сёння ў Францыі.




**Здымак 8.** Інжынер-электрык Людвік Талочка ў Пецярбургу.

Так здарылася, што апошняй апорай фамільных традыцый у Ракавіцы застаўся Тэадор Талочка (здымак 9). Ён, як і яго старэйшыя браты, пачаў навучанне ў Белападляскай гімназіі, але за невыкананне субардынацыі, або проста кажучы за «бунтарства», быў выключаны з гімназіі. Таму сярэднюю адукацыю атрымаў у тэхнічнай чыгуначнай школе ў Варшаве, пасля чаго з вялікай ахвотай паехаў вучыцца ў сельскагаспадарчае вучылішча ў Чарнігаве, якое ён закончыў з адзнакай "выдатна", затым прайшоў добрую сельскагаспадарчую практыку ў Клайпедзе і Панявежысе (Літва). Па вяртанні дамоў ажаніўся з Ядвігай з Паніквіцкіх (здымак 10) са Шчытнікаў (побач з Ракавіцай) і ўзяў у арэнду маёнтак Сычы (таксама непадалёку ад Ракавіцы), які ў хуткім часе выкупіў. Трэба адзначыць, што малады гаспадар поўны энергіі і энтузіязма вельмі дасканальна выкарыстаў свае атрыманныя веды і ў хуткім часе параўнальна невялікі маёнтак зрабіўся ўзорным. Тут была ферма на 100 кароў, млечарня с дастаўкай масла да Брэста, была выпісана з-за мяжы сучасная сельскагаспадарчая

тэхніка, што дапамагло мадэрнізаваць вытворчасць і зрабіць гаспадарку перадавой для свайго часу. Акрамя гэтага ў маёнтку быў свінарнік і невялікі спіртазавод. Адным словам – замкнёны сельскагаспадарчы цыкл. На жаль, у тыя часы за такую справу ніякіх дзяржаўных адзнак не давалі. Добра пастаўленная справа прыносіла гаспадару не толькі прыбытак, але і, што мусіць галоўнае, неверагодную асалоду ад здзейсненага.



***Здымак 9.*** Тэадор Талочка (1876-1946).



***Здымак 10.*** Ядвіга Талочка з Паніквіцкіх – жонка Тэадора.

Тэадор Талочка не супакойваецца на дасягнутым і едзе пазнаваць сельскагаспадарчую навуку ў Бельгію, што дало яму магчымасць ужываць перадавыя для таго часу сельскагаспадарчыя прыстасаванні і тэхналогіі на Берасцейшчыне. Гэта быў цудоўны перадавы вопыт для ўсёй акругі. У гэты ж час у маладой сям'і з'яўляюцца дзеці: сын Тадэвуш (1903 г.), дачка Казіміра (1905 г.) і сын Здзіслаў (1907 г.). Тэадор у Сычах змог таксама па-сучаснаму ўпарадкаваць і быт. У доме была каналізацыя, лазня і адзіны ў акрузе першы сельскі тэлефон, трэба думаць, дзякуючы старэйшаму брату Людвіку. Па тым часам гэта была недасягаемая якасць жыцця. Але выбухнула першая сусветная вайна, і ўвесь вынік 14-цігадовай добраякаснай працы быў змарнаваны за адзін дзень. 16 жніўня 1915 года Сычы, як і ваколіцы, апусцелі, кароў і свіней забралі да Брэста, спірт выпілі салдаты, упіўшыся пры гэтым "да смерці", тэхніку гаспадарчую знішчылі, а сям'я, пагрузіўшыся паспешна на два вазы, рушыла ў бежанцы праз Нясвіж і Мінск да Кіева. Тут у 1917 годзе на свет з'яўляецца апошняя дачка Зоф'я.



***Здымак 11.*** Зоф'я Талочка-Сверч – сіньёра роду (2003 г.).

Атрымаўшы ад дзяржавы кампенсацыю за панесеныя страты, няўрымслівы Тэадор пачынае новае жыццё і ў цэнтры Кіева купляе 5 малочных лавак з млечарняй і наладжвае гандаль малаком. Але рэвалюцыя падвяла чарговы вынік, і весь «бізнэс» у чарговы раз загінуў.

Летам 1918 года Тэадор Талочка, здабыўшы нейкім цудам у немцаў таварны вагон (цяплушку), загружае туды ўсю сям`ю з дзвюма каровамі і дзвюма канямі і выбірае напрамак да Ракавіцы, дакладней да Брэста. Незвычайнае падарожжа дадому цягнулася некалькі тыдняў. Як успамінае цяпер пані Зоф`я Талочка-Сверч, засталіся жыць толькі дзякуючы каровам і добраму валоданню нямецкай мовай яе бацькам Тэадорам. Вакол панавалі разруха і голад. Гэта ж самае яны ўбачылі і ў сваіх родных кінутых мясцінах. Трэба зноў было ўжо ў каторы раз налажваць жыццё. Да гэтага часу Ракавіца пасля смерці дзядзькі Юльяна адышла да Тэадора Талочкі. У Сычах, якія яны пакінулі пры эвакуацыі 1915 года, засталі поўны разгром, ваколіцы былі цалкам без людзей, адзінымі жывымі істотамі ў акрузе акрамя іх былі прывезеныя дзве каровы і два кані. Жыць было немагчыма, таму Тэадор сваю жонку з чатырмя малымі дзецьмі адправіў да радзіны ў Варшаву, а сам у чарговы раз паспрабаваў аднавіць гаспадарку. З гэтай нагоды ён ўтварае ў Брэсце сельскагаспадарчае таварыства, старшынёй якога

з'яўляецца да пачатку другой сусветнай вайны, наладжвае цэлы шраг кантактаў, праз свайго брата – міністра Людвіка Т. ад улады атрымлівае для Палесся 15 трактароў «Фордзонаў» (можа рэшткі той тэхнікі да гэтага часу дзе-небудзь заваляліся – хто ведае?), і пайшло, і паехала... Але новая вайна 1920 года і на гэты раз падводзіць свой вынік.

Пасля 1920 года Тэадору Талочку ўдаецца аднавіць бацькоўскае гнязло ў Ракавіцы. На маленькай рачулцы Сароцы, прытоку Буга, ён будуе спраўныя рыбныя стаўкі, якія да гэтага часу яшчэ карыстаюцца попытам, а яшчэ раней у 1908 годзе на фамільных могілках мінавіта Тэадор пабудаваў каплічку-пахавальню ў стыле неаготыкі, якую вар'яты спрабавалі ў 1960-х гадах зламаць, але да канца гэтага зрабіць не здолелі. Так і стаіць тая каплічка надломленая (здымак 4), каб сароміць нас з вамі за чужыя грахі.



*Здымак 12.* Найдзенная срэбранная ложачка з радзіннага дому.

Як успамінае цяпер ужо "сеньёра" роду Талочкаў Зоф'я (здымак 11): «Стары партэравы невялікі дом у Ракавіцы быў для ўсіх нас паміж войнамі месцам шчаслівасці». Але ўсё гэта скончылася 1 верасня 1939 г. Зноў у каторы час пачалася вайна. Як чуем ад пані Зоф'і: «Сталі мы выгнанымі, бяздомнымі, вісячымі паміж небам і зямлёй». Хутка Тэадорам таксама зацікавілася гестапа. Шукаючы нейкае выйсце Зоська, так зваў яе бацька, разам са сваёй сястрой пехатой перапраўляюцца праз Буг і вяртаюцца ў 1942 годзе ў Ракавіцу. Мясцовыя людзі, пабачыўшы іх, ахнулі, таму што ведалі ўжо пра гестапа. Іх схавалі ў капліцы на могілках і неслі, і неслі яйкі – з таго часу пані Зоф'я страў з яек не ўжывае. У 1946 годзе пасля вайны далёка ад роднай Ракавіцы, якой так многа аддаў сваёй энергіі, у Радоме памірае Тэадор Талочка – апошні гаспадар гэтага цудоўнага кутка каля Брэста, там ён і пахаваны. Даўно ўжо няма і таго старога дома, які на нейкія там спешныя справы разабралі і пра ўсё хутка забылі. Але як гэта неверагодна, памяць аб тым доме засталася. Адзін з жыхароў Ракавіцы, Семянюк, які добра ведаў Тэадора, захаваў срэбраную ложачку і наказаў свайму сыну, калі той дажыве да таго часу, калі хтось з роду Талочкаў сюды прыедзе, перадаць тую ложачку ім. Так і здарылася ў маі 2003 года. Тая ложачка, як вялікая сямейная рэліквія з Ракавіцы, была цудоўным чынам перададзена Зоф'і Талочка-Сверч (здымак 12). Можа гэта і ёсць знак гістарычнай памяці? Але ці можам мы сёння да канца ўсвядоміць самі сабе хто мы ёсць – беларусы, калі з такой лёгкасцю пазбаўляем сабе сваёй жа гісторыі? Няўжо так многа сродкаў патрабуецца, каб цудоўнае месца вызначыць часткай нашай гісторыі!?

Аўтар шчыра дзякуе Зоф'е Талочка-Сверч за прадастаўленыя матэрыялы з сямейнага архіву. Сучасныя здымкі аўтара.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Wawrzyńczuk A. Razwój welki ulasnosci na Podlasiu w XV-XVI w.w. Wroclaw, 1951, s. 82.
2. Несцярчук Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX стагодзяў. Мн.: БЕЛТН, 2002, с. 52.
3. Historia Rakowicy. Фамільны архіў роду Талочкаў. Варшава.
4. Drzewo genealogiczne rodziny Tołłoczków. Фамільны архіў роду Талочкаў. Варшава.
5. Гладыщук А.А. Профессор Станислав Толлочко – выдающийся химик и педагог. Вестник БГТУ. – Брест, 2002, № 5, С. 93-96.
6. Гладыщук А.А. Заповедная каплица. Вечерний Брест (региональная газета), 2002, № 92.
7. Rusiewicz Z. Stanislaw Tolloczkó (1868-1935) – jeden z pierwszych fisikochemikow polskich. Wiadomosci chemiczne, zeszyt 7-9, 1985, s. 379-399.
8. Kubiatowski J. Inz. Ludwik Tolloczkó (1870-1957). Energetyka, Nr. 2, 1970, s. 71.
9. Гладыщук А.А. Инженер Людвик Толлочко через призму «машины времени». Брестская газета, 2003, № 14.
10. Гладыщук А.А. «Алло Смольный?». Вечерний Брест (региональная газета), 2003, № 31.
11. Гладышчук А.А. Людвік Талочка ў прызме «машыны часу». Мінск, «Звязда», 2003, № 181.
12. Гладыщук А.А. На благо России и Польши. Москва. Литературная газета, 2003, № 27.
13. Гладыщук А.А. Инженер Людвик Толлочко в призме машины времени. Минск: Изобретатель, 2003, № 5-6, С. 10-12.


УДК 947.65"18/19"

***Воронич Т.В.***

## ГОРОДСКАЯ ДУМА И БЮДЖЕТ ГОРОДА ВИТЕБСКА НА РУБЕЖЕ XIX - XX ВВ.

Витебск был одним из крупнейших и наиболее экономически развитых городов западных губерний на рубеже XIX - XX вв. и важным административным центром региона. Здесь функционировали учреждения трех уровней - губернского, уездного и городского, находившиеся в подчинении разных министерств и ведомств.

***Воронич Татьяна Владимировна****, магистр гуманитарных наук, аспирант Белорусского государственного университета. Беларусь, БГУ, г. Минск.*